Другасныя дзеяслоўныя і іменныя намінацыі як феномен адлюстравання спецыфікі беларускай нацыянальнай карціны свету

ДРУГАСНЫЯ НАМІНАЦЫІ, СЕМАНТЫЧНАЯ ДЭРЫВАЦЫЯ, ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНЫ ВАРЫЯНТ, МАДЭЛЯВАННЕ, СУБСТАНТЫЎ, АД'ЕКТЫЎ, ЗАЙМЕННІК, ДЗЕЯСЛОЎ, МЕТАФАРА, ДЫСКУРС, ВОБРАЗ ЧАЛАВЕКА, СЛОЎНІК

Другасныя дзеяслоўныя і іменныя намінацыі як феномен адлюстравання спецыфікі беларускай нацыянальнай карціны свету [Тэкст]: справаздача аб НДР (закл.): / БДПУ; кір. Старычонак В.Д.; выкан. Рабава Т.М., Іватовіч-Бабіч В.Т. і інш.- Мн., 2020. - 215 с., 3 табл., 2 схемы, 31 дад. - Бібліягр.: С. 188-196 (111 назв.). - № ДР 20161479.

**Аб'ект:** другасныя субстантыўныя, ад'ектыўныя, займеннікавыя і дзеяслоўныя намінацыі ў беларускай мове.

**Мэта**: устанавіць асноўныя заканамернасці сэнсавага развіцця другасных дзеяслоўных і іменных (субстантыўных, ад'ектыўных і займеннікавых) намінацый у беларускай мове і распрацаваць тэарэтычныя асновы тыпалогіі другаснай намінацыі.

**Метады:** метад слоўнікавай (дэфініцыйнай) ідэнтыфікацыі, кампанентнага аналізу, семантычнага мадэлявання, прыёмы і алгарытмы апісальнага, кантэкстуальнага, лінгвастатыстычнага метадаў.

**Вынікі:** складзены першы ў беларускай лексікаграфічнай практыцы Вялікі слоўнік другасных намінацый. Устанаўлены асноўныя семантычныя мадэлі (прамыя і абарачальныя) другасных субстантыўных, ад'ектыўных, займеннікавых і дзеяслоўных намінацый і тыповыя сітуацыі іх разгортвання, нестандартныя механізмы і спосабы ўтварэння адзінак семантычнай дэрывацыі. Выяўлена спецыфіка рэпрэзентацыі вобраза чалавека як носьбіта нацыянальна-культурных і гістарычных традыцый, рэтранслятара культурных дамінант, каштоўнасных уяўленняў і філасофскіх асноў жыцця беларускага народа. Устаноўлена спецыфіка другасных намінацый у мастацкім і публіцыстычным дыскурсе (на матэрыяле твораў Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Дубоўкі, Уладзіміра Жылкі, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Ніла Гілевіча і інш.). Упершыню праведзена класіфікацыя другасных дзеяслоўных намінацый метэаралагічнага, дэструктыўнага, гастранамічнага, акцыянальнага, ментальнага і іншых фрэймаў. Выяўлена спецыфіка рэпрэзентацыі ў беларускай мове ментальных і канататыўных другасных намінацый. Выяўлены новыя заканамернасці функцыянавання беларускай мовы, яе нацыянальная спецыфіка, механізмы ўзаемадзеяння ментальных і моўных структур, павышана якасць выкладання сучаснай беларускай мовы ва ўмовах глабалізацыйных і інтэграцыйных працэсаў.

**Ступень укаранення**. Навучальны працэс у БДПУ пры выкладанні мовазнаўчых і літаратуразнаўчых курсаў, распрацоўцы і правядзенні

спецкурсаў і спецсемінараў, напісанне дыпломных і магістарскіх прац, напісанне сучасных падручнікаў і навукова-метадычных дапаможнікаў.

**Галіна выкарыстання.** Даследаванне вобразна-выяўленчых сродкаў і розных відаў дыскурсу іншых славянскіх і неславянскіх моў. Лексікаграфічная практыка, прафесійная дзейнасць спецыялістаў у галіне інфармацыйных тэхналогій, мовы інтэрнэту, сфера рэкламы.